# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

***

Як трасло,
Грымела ў Бухарэсце –
Ў Магілёве ў час начны пачулі.
Вокны, люстры на маім паверсе
Здрыгануліся ў маўклівым гуле.

Зазвінела тоненькае шкельца,
Зараз, зараз з вышыні сарвецца…
Гэта яшчэ раз пасля Ташкента
Мне пагрукала планета ў сэрца.

І ўжо ў сэрцы ўскалыхнула гулка
Ўсе шляхі мае між небасхілаў;
У куточку ўсхліпнула рачулка,
Быццам страшны сон яна прысніла.

Дзесь руіны там – над эпіцэнтрам,
Быццам бы вайна зноў пахадзіла.
Боль і гэты па-салдацку сцерпім:
Грозна ўсё ў прыродзе – ды праўдзіва.

Несучы і смерць і разбурэнне,
Шар зямны няшчадна патрасае.
Толькі б, толькі б не землетрасенне,
Што рыхтуюць людзям
людзі самі.

*Аляксей Пысін*
*1977*

**Для даведкі:** 26 красавіка 1966 года ў Ташкенце адбылося землетрасенне, у выніку якога цэнтральная частка горада была амаль поўнасцю знішчана. Загінулі 8 чалавек, каля 200 гаспіталізаваны з рознымі траўмамі. Былі разбураны 2 млн квадратных метраў жылля, 236 адміністрацыйных будынкаў, каля 700 аб’ектаў гандлю і грамадскага харчавання, 181 вучэбная ўстанова, 36 устаноў культуры і шмат іншых устаноў. Амаль 300000 жыхароў засталіся без даху над галавой.

4 сакавіка 1977 года адбылося Карпацкае (Бухарэсцкае) землетрасенне. Падземныя штуршкі адчуваліся на вялікай частцы Усходне-Еўрапейскай раўніны, у тым ліку і ў Беларусі. Ахвярамі гэтых падзей у Румыніі сталі 1578 чалавек, у тым ліку 1424 загінулі ў Бухарэсце, больш за 11300 чалавек атрымалі раненні. У горадзе Свіштоў (Балгарыя) загінулі каля 100 чалавек.